имидж любой страны, в том числе и Беларуси, будет иметь только положительный оттенок.

*Литература*

1. Беларусь олимпийская. Фотоальбом //Андриевич В.В., Маринина А.В.. Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі. – Минск., 2016.
2. Sovsport.ru. Комментарии // Павел Копачев. «Виталий Щербо: Задорнов говорит, что американцы тупые. Но они просто видят жизнь в других цветах» [Москва., 2001, с.3].
3. Наш Спорт. Журнал // Владимир Зданович. «Виктория Азаренко: Я стараюсь на все происходящее обращать минимум внимания, а просто профессионально делать свою работу». [Минск, 2015, С. 8].
4. Pressball.by. Articles/blogs/sochi //Татьяна Лукашевич. Дарья Домрачева: давайте развивать свои таланты [Минск., 2014. С. 2].
5. AIPS sport media World. Журнал Международной ассоциации спортивной прессы // Gianni Merlo. Rio 2016 Olimpics. – Лозанна, 2016. – С. 11.
6. Президент. Лукашенко вручил госнаграды лучшим спортсменам и тренерам по итогам пятилетия // Belta.by [Электронный ресурс]. – 2015.

**Наталля ЗУБЧОНАК**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ДЗЕЙНАСЦЬ ЧАСОПІСА «МАЛАДНЯК» У КАНТЭКСЦЕ СУЧАСНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ СМІ

Сучасныя сродкі масавай інфармацыі пад уплывам цэлага комплексу фактараў перажываюць складаныя трансфармацыйныя працэсы, якія адбіваюцца як на змесце і структуры выданняў, так і на прынцыпах функцыянавання саміх рэдакцый. Так, у апошні час была ажыццёўлена рэарганізацыя дзейнасці дзяржаўных грамадска-палітычных выданняў, у выніку якой сёння ў Рэспубліцы Беларусь працуе выдавецкі дом “Звязда”, які аб’ядноўвае беларускамоўны друк, і медыяхолдынг “Советская Белоруссия”, у які ўвайшлі буйнейшыя рускамоўныя грамадска-палітычныя газеты. Пад уплывам развіцця новых інфармацыйных тэхналогій значныя змены назіраюцца і ў дзейнасці маладзёжных СМІ. У гэтай сувязі мэтазгодным будзе звярнуцца да выдавецкага вопыту газет і часопісаў савецкага часу, паколькі многае са зробленага можна прадоўжыць і ў новых умовах канвергенцыі.

Сістэма маладзёжнага друку БССР уключае дастаткова вялікую колькасць перыядычных выданняў, якія паспяхова працавалі над выкананнем рознага кшталту задач, выкліканых новым часам. Адной

з галоўных, безумоўна, з’яўлялася выхаванне пакалення грамадзян, адданых радзіме, ідэалам камуністычнай партыі, здольных актыўна ўключыцца ў працу і змаганне за ўласныя ідэалы, будучыню савецкай краіны. Значны след у гісторыі беларускага друку пакінулі такія газеты і часопісы, як “Чырвоная змена”, “Піянер Беларусі”, “Сталинская молодежь” (“Знамя юности”), “Беларускі піянер”(“Бярозка”) і многія іншыя. Менавіта на іх аснове была створана сучасная сістэма маладзёжнай прэсы, прынцыпы творчай дзейнасці, закладзеныя ў 20-я гады XX ст., сёння актыўна выкарыстоўваюцца, напаўняюцца новым зместам.

У шэрагу маладзёжных выданняў асобнае месца займае часопіс “Маладняк” – орган аднайменнага літаратурнага аб’яднання, масавы і вельмі папулярны ў свой час. Першы яго нумар выйшаў у жніўні 1923 г. як выданне ЦК ЛКСМБ (з 1926 г. – орган ЦК КП(б)Б і ЛКСМБ, Цэнтральнага бюро літаратурнага аб’ядання “Маладняк”; з 1928 г. – яшчэ і БелАПП; у 1932 г. – орган Аргкамітэта Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР). Лепшыя літаратурныя сілы, таленавітыя беларускія пісьменнікі і паэты прынялі ўдзел у стварэнні выдання, а потым ажыццяўлялі кіраўніцтва. Імёны У. Дубоўкі, М. Зарэцкага, К. Крапівы, М. Лужаніна, К.Чорнага, З. Бядулі, М. Чарота і многіх іншых сёння ўзначальваюць спіс лепшых прадстаўнікоў нацыянальнай літаратуры, яе класікаў, чый талент толькі ўмацоўваўся на працягу стагоддзя. Такім чынам, праз выданне загартоўвалася пакаленне таленавітай моладзі пад кіраўніцтвам вопытных майстроў слова. Літаратурны працэс і грамадскае жыццё аб’ядноўваліся і крочылі разам да новай будучыні, адлюстроўваючы ў творах яе ідэалы.

Аб масавасці і папулярнасці “Маладняка” сведчыць і той факт, што паступова філіялы самой пісьменніцкай арганізацыі з’яляліся ў іншых беларускіх гарадах, а пазней там жа выходзілі асобныя выданні: “Маладняк Калінішчыны”(Клімавічы, 1924-1926 гг.), “Маладняк Барысаўшчыны” (Барысаў,1926 г.), “Аршанскі Маладняк” (Орша, 1928 г.). Альманахі маладнякоўцаў выдавалі ў Полацку, Віцебску, Магілёве, Бабруйску. Суполкі беларускіх студэнтаў, членаў “Маладняка”, наладжвалі выпуск часопісаў у Маскве, Ленінградзе, Смаленску. З 1925 г. аб’яднанне “Маладняк” папоўнілася рускай, польскай і яўрэйскай секцыямі. Такім чынам, беларускі літаратурна-грамадскі працэс паступова пашыраўся далёка за межы рэспублікі.

Тыраж часопіса вагаўся ад 2-х да 3-х тыс. экземпляраў. Аб’ём паступова павялічваўся: калі першая кніжка складалася з 70 старонак, то пазнейшыя нумары змяшчалі ўжо 190. Выходзіла выданне адносна рэгулярна: 10-12 разоў у месяц, толькі у першыя гады колькасць кніжак

была невялікай(1-4). Афармленне часопіса, у параўнанні з нашым часам, было даволі сціплым: выкарыстоўваліся графічныя мініяцюры да мастацкіх твораў, партрэты аўтараў з уласнымі подпісамі, радзей фотаздымкі, фотаілюстрацыі, шрыфт таксама быў самым звычайным, часам прымянялі курсіў.

З пазіцыі дня сённяшняга структура выдання, яго змест выглядаюць даволі ўнушальна. Літаратурна-мастацкі аддзел змяшчаў празаічныя і паэтычныя творы, як сталых пісьменнікаў і паэтаў, так і маладнякоўцаў. Напрыклад, у № 8 за 1925 г. былі надрукаваны вершы П. Труса, Я. Пушчы, А. Якімовіча, апавяданне К. Чорнага. Гэты ж нумар меў раздзел “Сатыра”, у якім выйшлі верш і апавяданне К. Крапівы. Грамадска-палітычны аддзел прадстаўляў інфармацыю па актуальных пытаннях сучаснага жыцця: рэалізацыі палітыкі беларусізацыі(!), гістарычных тэмах, антырэлігійнай кампаніі, прынцыпах сацыялістычнага будаўніцтва, паведамленні са з’ездаў партыі, новабудоўлях, жыцці і дзейнасці У.І. Леніна. Актуальнымі для моладзі з’яўляліся пытанні працаўладкавання, этычных паводзін у грамадстве, здаровага ладу жыцця, камсамольскага руху і многае іншае. У раздзеле “Крытыка, кнігапіс і хроніка” друкаваліся рэцэнзіі на асобныя творы, расказвалася пра кніжныя навінкі, каменціраваліся памылкі друку. У асобных нумарах змяшчаліся рубрыкі адукацыйнага зместу ці забаўляльнага, напрыклад, “Задачкі”, сатырычныя апавяданні, гумарэскі. Асобнай увагі заслугоўвае публіцыстычны змест выдання, глыбокі аналіз праблем рэчаіснасці, чаго сёння бракуе перыядычным выданням. Ідэяй уключанасці моладзі ў грамадскае жыццё былі прасякнуты ўсе публікацыі “Маладняка”. Менавіта дзякуючы дадзенай канцэпцыі выданне карысталася такой папулярнасцю, што было вядома далёка за межамі БССР.

Выдавецкая дзейнасць “Маладняка” – яшчэ адна важная старонка ў гісторыі часопіса. Папулярызацыя беларускай літаратуры ў шэрагах моладзі, уключэнне яе ў грамадска-палітычны працэс дазволілі пашырыць сферу дзейнасці выдання. У 1925 г. была заснавана серыя літаратуры “Бібліятэчка Маладняка”. Толькі за 1925-1926 гг. выйшла 28 кніг твораў ужо добра вядомых і маладых паэтаў і пісьменнікаў-маладнякоўцаў (3. с. 101).

Такім чынам, дзейнасць перыядычных выданняў, якія выходзілі ў БССР, стала добрым падмуркам для эфектыўнага функцыянавання сучасных сродкаў масавай інфармацыі, вызначыла напрамкі іх далейшага развіцця. Выдавецкі вопыт, а таксама ўзровень прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў рэдакцый многіх газет і часопісаў нават па сучасных мерках цалкам адпавадаюць самым высокім крытэрыям.

Практыка арганізацыі дзейнасці часопіса “Маладняк” – адна з самых яскравых і значных старонак у гісторыі маладзёжнага друку БССР, выдатны прыклад папулярызацыі нацыянальнай літаратуры і публіцыстыкі за межамі краіны.

*Літаратура*

1. Маладняк, 1925. № 8.
2. Маладняк, 1926. № 10.
3. Слука А.Г. Беларуская журналістыка: Вучэб дап.:У 3 ч.Ч.2/А.Г. Слука. – Мн.:БДУ, 2003. – 235 с.

**Віктар ІЎЧАНКАЎ**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ПАЛІТКАРЭКТНАСЦЬ: ФЛЁР ПАДМАНУ ЦІ ЛІНГВІСТЫЧНАЯ АДНОСНАСЦЬ?

Прырода паліткарэктнасці базуецца на пазначэнні моўнага факта апісальным эўфемізмам, які ўяўляецца імпліцытным індэксам апасродкаванай забароны пэўных слоў і выразаў. Перад намі «палітычнае пісьмо», задача якога ў адзін прыём злучыць рэальнасць фактаў з ідэальнасцю мэтаў, дзе сэнс знішчаецца ў межах самога слова, якое адначасова становіцца і сродкам канстатацыі факта, і яго ацэнкай. Слова зацягваецца флёрам падману і ператвараецца ў алібі, у сведчанне аб адсутнасці на месцы злачынства, у апраўдальны акт. У такім разе грэбаванне элементарнай праўдай прыводзіць да чалавечай катастрофы, поўнага «размыкання» рэчаіснасці: на сапраўдную і перлакутыўную, падпарадкаваную мэтавым установкам. Міжвольнымі каталізатарамі такіх працэсаў з’яўляюцца СМІ.

Катэгорыю паліткарэктнасці звязваюць з гіпотэзай лінгвістычнай адноснасці Сепіра-Уорфа, сутнасць якой зводзіцца да лексічнай і граматычнай неадпаведнасці ўладкавання моў свету. Заўважым, назва гіпотэзы ўмоўная, бо ставяцца пад сумненне суаўтарства вучоных і само вылучэнне імі ідэі. Ці насамрэч катэгорыі лінгвістычнай адноснасці і паліткарэктнасці звязаны паміж сабой?

Паводле Франца Бааса, мова выконвае класіфікавальную і сістэматызавальную функцыі. Першая з іх рэалізуецца ў звужэнні ўніверсальнай канцэптуальнай прасторы да тых кампанентаў, якія найбольш істотнымі з’яўляюцца для канкрэтнай культуры. Адсюль Ф.Баасам рабілася выснова: мысленне носьбіта мовы вызначаецца мо-